# ВЯРТАНЬНЕ ДА ЛЮДЗЕЙ

**Фарны касьцёл у Гродне**

СТРАЧАНАЯ СПАДЧЫНА

**Алесь Краўцэвіч, Алег Трусаў, Ігар Трусаў**

*Помнік, пра які пойдзе гаворка, не стала ў лістападзе 1961 года — ён быў зьнішчаны ўладамі Гродна па загаду «дырэктыўных органаў». Але немагчыма, нават з дапамогай выбуховых матэрыялаў, вырваць старонку з летапісу ўласнае гісторыі.*

Так званая «Фара Вітаўта» — мураваны касьцёл у Гродне на Рынку — была пабудавана ў 1584—1587 гадах. Гэта быў адзін з вялікіх каталіцкіх храмаў у Вялікім княстве Літоўскім, фактычна адзін з нешматлікіх здабыткаў рэнесансу ў нашым краі.

Галоўныя крыніцы, непасрэдна зьвязаныя з гісторыяй «Фары Вітаўта», былі страчаны ў час маскоўскай навалы ў сярэдзіне XVII ст. Таму і расійскія, і польскія дасьледчыкі гісторыі Гродна памылкова лічылі, што касьцёл быў пабудаваны адразу пасьля фундацыі Вітаўта ў 1392 і не пазьней чым у 1494 г.

Гэта памылка трымалася да нядаўняе пары, і толькі ў артыкуле А. Мілінкевіча і Ежы Пашэнды было праліта сьвятло на складаную гісторыю помніка. Чатыры гады таму ксёндз-езуіт з Кракава Ежы Пашэнда зацікавіўся гісторыяй комплексу езуіцкага касьцёла і кляштара ў Гродне. У пошуках яму дапамагаў краязнавец, дацэнт гродзенскага універсітэта Аляксандр Мілінкевіч. Дасьледчыкам удалося праверыць і адкінуць традыцыйную версію аб пабудове мураванага фарнага касьцёла ў Гродне ў 1494 годзе. Абапіраючыся на ватыканскія і маскоўскія крыніцы, яны высьветлілі, што мураваны касьцёл быў узьведзены ў 1587 г. [1]

Такім чынам, вялікі будынак на Рынку, які добра відаць на гравюры М. Цюнта 1568 г., — **драўляная** «Фара Вітаўта», пабудаваная пасьля 1392 г.

Аднак не пазьбеглі храналагічнай недакладнасьці таксама А. Мілінкевіч і Е. Пашэнда. У сваім артыкуле (у «Нашым радаводзе» [2]) яны сьцьвярджалі, што драўляная фара існавала ўжо ў 1389 г., спасылаючыся на прывілей Вітаўта гродзенскім жыдам [3]. Але ўжо не менш як пяць гадоў вядома, што гэты прывілей — фальсіфікат [4], таму драўляная фара не магла быць пабудавана раней 1392 г.

Дакладна вядома, што драўляны касьцёл рамантаваўся паводле загаду каралевы Боны Сфорцы ў 1551 г. Стэфан Баторый у лісьце да правінцыяла ордэна езуітаў Кампаны піша ў 1584 г. «найбольшым і найуспанялшым у Вялікім княстве Літоўскім, але драўляным»... зьяўляецца гродзенскі фарны касьцёл пры Рынку.

Пабудову мураванага касьцёла на Рынку трэба цалкам зьвязваць з асобай Стэфана Баторыя. Гэты кароль, прыхільнік езуіцкай сістэмы адукацыі, пажадаў адкрыць езуіцкую школу ў сваім улюбёным горадзе Гродне. Ён правёў размовы наконт гэтага з Кампанам. Аднак той не сьпяшаўся пагадзіцца, таму што ў гэты час ішла арганізацыя калегіумаў і школ у Вільні, Бярэсьці і Замосьці і ў езуітаў проста не хапала кадраў. Але кароль налягаў, і ў рэшце рэшт Стэфан Баторый і Кампана пагадзіліся, што спачатку кароль пабудуе ў Гродне мураваны касьцёл і толькі тады езуіты адкрыюць у Гродне школу, або навіцыят, і, магчыма, калегіум.

Стэфан Баторый апантана ўзяўся за справу. Ён дамогся ад гродзенскага пробашча вылучэньня пляца для будаўніцтва мураванага касьцёла побач з драўлянай фарай.

Найбольш верагодна, што аўтарам праекта мураванага касьцёла быў Санці (Ксанці) Гучы — архітэктар караля. Паводле сьведчаньня Юзафа Ядкоўскага, гэты таленавіты італьянскі архітэктар, напэўна, быў запрошаны ў Гродна вельмі вядомым у Еўропе равінам па мянушцы Левуш (сапраўднае імя — Мардхай-Абрам Ёфэ). Ён запрасіў Гучы прыняць удзел у пабудове мураванай сінагогі на школьным двары ў Гродне. Гучы будаваў, мусіць, т. зв. «Батароўку» і перабудаваў Стары замак. Як бы там ні было, на гравюры Гродна 1600 г., якую прыпісваюць знакамітаму мастаку Тамашу Макоўскаму, выява мураванага гродзенскага касьцёла на Рынку мае выразныя рысы маньерызму, тыповыя для творчасьці Санці Гучы.

Пабудова мураванага касьцёла прайшла хутка: пачалася паводле загаду Стэфана Баторыя восеньню 1584 г., а ўжо 5 сакавіка 1585 г. Кампана паведамляў генералу езуітаў, што на ўласныя вочы бачыў зробленыя падмуркі [5]. Як нам здаецца, зьнешнія працы па пабудове касьцёла былі скончаны ў канцы 1586 г., і тады неспадзявана памёр Стэфан Баторый. Менавіта ў сутарэньнях гэтага касьцёла захоўвалася цела караля да адпраўкі ў Кракаў (амаль паўгода). Пра скончаны будынак пісаў у лютым 1587 г. езуіт Марцін Латэрна і даў яму ацэнку: «Ён цудоўны» [6].

Пасьля сьмерці Стэфана Баторыя езуіты адмовіліся ад яго фундацыі. Касьцёл, як збудаваны на плябанскіх пляцах, быў перададзены парафіі. Нам уяўляецца, што ў 1587 г. і была разабрана драўляная «Фара Вітаўта», а яе функцыі стаў выконваць новы мураваны касьцёл.

Добры стан і прыгожы выгляд, які меў касьцёл на гравюры 1600 г., напэўна, страціліся падчас маскоўскай навалы ў 1655 г., калі маскоўскія салдаты ўшчэнт абрабавалі і, здаецца, падпалілі яго. Падчас візітацыі было сьцьверджана, што неабходна пільна рамантаваць скляпеньні, а дах хоць бы саломай пакрыць [7]. Дзякуючы намаганьням прэпазіта венскага і гродзенскага біскупа Аляксандра Хадкевіча паміж 1661 і 1674 гг. касьцёл адрамантавалі [8].

Падзеі Паўночнай вайны, па ўсім, зноў прывялі да моцнага пашкоджаньня касьцёла. На панараме Гродна са шведскай

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУ

З гравюры Тамаша Макоўскага (1600 г.)

З гравюры невядомага мастака.

Матэрыялы археалагічных раскопак (пачатак 1990-ых гг.).









РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Малюнак Напалеона Орды.

Матэрыялы археалагічных раскопак (пачатак 1990-ых гг.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ






Малюнак Напалеона Орды.

Здымак Фарнага касьцёла, перабудаванага ў праваслаўны храм

Матэрыялы археалагічных раскопак (пачатак 1990-ых гг.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Выгляд Гродна 1939 г.

Матэрыялы археалагічных раскопак (пачатак 1990-ых гг.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ХРОНІКА мастацкага жыцьця

### Аўстрыя

Міжнародная арганізацыя па народнай творчасьці ЮНЕСКА запрасіла на фестываль самадзейных і нацыянальных ансамбляў у Аўстрыі фальклорны ансамбль «Матылёк» з Гродна. Гэты калектыў створаны тры гады таму пры Гродзенскім татарскім культурным цэнтры.

### Германія

Журы VIII Міжнароднага фестывалю дакументальных фільмаў у Мюнхене прысудзіла Гран-пры вядомаму беларускаму кінамайстру Юрыю Хашчавацкаму за фільм «Усё добра». Гэта, па словах рэжысёра, расказ пра тых, хто ад'язджае ў Ізраіль, і пра яўрэйскую культуру. Узнагародай адзначана «нестандартнае вырашэньне нацыянальнай тэмы, майстэрства, вытанчанасьць, гумар і аптымізм». Сцэнарый стужкі напісаў Вадзім Сьпівак.

### Польшча

Міністэрства культуры і мастацтва Польшчы вырашыла, што першай супольнай польска-беларускай праграмай у галіне культуры будзе выпрацоўка праекта аднаўленьня парку і палаца ў Нясьвіжы. Па прапанове беларускага боку ўсімі работамі будзе кіраваць Анджэй Цеханавецкі, які нядаўна стаў ганаровым прафесарам Белдзяржуніверсітэта.

карты, датаванай прыблізна 1705 г., добра відаць, што на званавай вежы няма макаўкі, а замест яе вырасла дрэва [9]. Жахлівы стан касьцёла канстатуе пастанова гродзенскага павятовага сойміка («касьцёл сам патрабуе вялікай рэпарацыі...») [10], якая пералічвае патрабаваньні да паслоў ад Гародні на сойм 1720 г. у Варшаве.

Новыя пашкоджаньні закранулі гродзенскую Фару ў час вельмі моцных пажараў 1753 г. Аднаўляў касьцёл вядомы архітэктар Іаган Мёзер [11]. Рамонт, напэўна, быў скончаны да 1762 г., пра што сьведчыць візітацыя [12]. Праўда, у больш позьняй візітацыі 1793 г. гаворыцца, што касьцёл асьвечаны 18 красавіка 1758 г., з чаго вынікае, што першапачатковы рамонт быў зроблены да гэтай даты [13].

Яшчэ адзін удар лёсу напаткаў гродзенскую Фару ў 1782 г., калі яна зноў гарэла (пажар ахапіў увесь горад). Кароль загадаў заняцца рамонтам слыннаму архітэктару Джузэпе Сака [14]. Верагодна, Сака толькі распрацаваў праект перабудовы, але непасрэдна рамонтам да самай сьмерці ў 1793 г. займаўся пробашч Юзаф Мучыньскі [15].

Са сьмерцю Мучыньскага далейшы рамонт быў занядбаны, і ў 1797 г. функцыі парафіяльнага касьцёла былі перададзены колішняму езуіцкаму [16].

Фара прастаяла пячыннай да 29 лютага 1804 г., калі прыйшоў загад Расейскага Сьвяшчэннага Сінода: «апусьцелы ад пажару будынак Фарнага касьцёла, заснаванага каралевай Бонай, паправіць і, пасьля ўладкаваньня ў ім іканастаса, ператварыць у праваслаўны храм» [17]. Будынак атрымаў «касьметычны» рамонт, а потым быў урачыста асьвечаны ў гонар Сьв. Сафіі [18]. Больш капітальны рамонт адбыўся ў 1847 г., але і ён неістотна зьмяніў выгляд будынка [19]. Рамонты і дабудовы «прытвораў» рабіліся ў 1850, 1859, 1865 і 1870 гг.. Дарэчы, у 1870 г. паводле загаду гродзенскага губернатара былі разбураны крамы вакол царквы з боку Рынку і Замкавай вуліцы [20]. Гэты загад вyратаваў храм ад пажару 1885 г., калі згарэў практычна ўвесь горад.

9 мая 1892 года ў званавай вежы на адным з паверхаў паказаўся дым, а праз колькі хвілін полымя ахапіла ўсю вежу. Адразу прыбылі пратаіерэй, пажарныя, але вежа была такая высокая, што нельга было штосьці зрабіць [21]. Літаральна за паўгадзіны агонь зьнішчыў вышэйшыя паверхі званавай вежы, верхняя яе частка нахілілася на бок, абрынулася на дах, і той загарэўся. Бэлькі даху і рэшткі вежы прабілі ў скляпеньні дзірку дыяметрам каля 1,5 сажня (больш за 3 метры). Чатыры званы адзін за адным страцілі ўмацаваньні і ўпалі, прабіўшы чатыры перакрыцьці. Пажар удалося патушыць толькі ўвечары [22].

Праект пабудовы храма, а фактычна поўнай перабудовы ў псеўдарускім стылі, быў зроблены апалагетам русіфікацыі Паўночна-Заходняга краю акадэмікам Чагіным [23]. Да прац прыступілі вясной 1896 г., а «Сафійскі сабор» быў асьвечаны пасьля перабудовы і адкрыты 28 сакавіка 1899 г.

У 1920 г. польскія ўлады адабралі Сафійскі сабор у праваслаўнага ведамства і вярнулі католікам. Ужо ў канцы чэрвеня 1920 г. пры непасрэдным удзеле Юзафа Ядкоўскага (тады — ваяводскі кансерватар помнікаў) пачаліся працы па рэстаўрацыі гродзенскай Фары. У 1925 г. да гэтай справы далучыўся архітэктар Оскар Сасноўскі. Ён зрабіў праект адбудовы «Фары Вітаўта», амаль не апіраючыся на навуковыя крыніцы. Ю. Ядкоўскі прыпыніў рэалізацыю праекта, якая залежала ад вынікаў навуковых дасьледаваньняў.

На жаль, польскія рэстаўратары зыходзілі з памылковай версіі пра гатычны характар храма, яны лічылі яго больш раньнім. Таму адбудова ў 1924—1934 гг. не мела пад сабой навуковага і мастацтвазнаўчага грунту. Замест рэнесансавага маньерыстычнага касьцёла была зроблена гатычная пабудова.

У такім выглядзе гродзенская Фара прастаяла да 1961 г., калі па ініцыятыве дырэктара краязнаўчага музея і «дырэктыўных органаў» гарвыканкам прыняў рашэньне ўзарваць помнік. 29 верасьня сьпецыялісты «Ленвыбухпрама», вайсковыя сапёры і супрацоўнікі КДБ выканалі гэты варварскі прысуд [24].

У 1992 г. па ініцыятыве гарадскіх уладаў пачаліся археалагічныя дасьледаваньні гродзенскага фарнага касьцёла.

Зьнішчэньне «Фары Вітаўта» парушыла цэласнасьць архітэктурнага ансамбля гістарычнага цэнтра. Гмах касьцёла зьяўляўся адной з архітэктурных дамінантаў, на якую была зарыентавана гарадская вулічная сетка. Страта помніка тым большая з-за яго высокіх мастацкіх вартасьцяў.

Мяркуецца, што археалагічныя раскопкі павінны пакласьці пачатак праграме вяртаньня помніка ў культурнае жыцьцё. Мы не можам разьлічваць у бліжэйшы час на яго поўнае аднаўленьне. Патрэбны немалыя сродкі, якія зараз знайсьці немагчыма. Аднак рэальнай падаецца музеефікацыя рэштак касьцёла, якую можна зрабіць хутка і без вялікіх фінансавых затрат.

Захавалася даволі шмат планаў касьцёла рознага часу, аднак ніводны з іх, як высьветлілася з пачаткам раскопак, нельга назваць дакладным. На паверхні зямлі не засталося ніякіх сьлядоў, руіны разраўнялі і разьбілі сквер.

Акрамя таго археалагічныя раскопкі павінны сабраць інфармацыю, неабходную для аднаўленьня помніка.

Перад першым этапам дасьледаваньняў (май—ліпень 1992 г.) стаялі дзьве асноўныя задачы: 1. Вызначэньне дакладнага месцазнаходжаньня муроў касьцёла; 2. Поўнае ўскрыцьцё яго часткі для вызначэньня стану муроў, якія засталіся. Агульнае кіраўніцтва экспедыцыяй ажыцьцяўляў А. Трусаў. Першая задача была вырашана гродзенскім археолагам Р. Акінчыцам, які з дапамогай шурфаў акрэсьліў контуры будынка. Потым на падставе здабытай праз шурфы інфармацыі быў закладзены раскоп (кіраўнік А. Краўцэвіч), які ўскрыў паўночную частку апсіды і прыбудовы да яе. У дасьледаваньн-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

пях удзельнічаў супрацоўнік аддзела археалогіі Дзяржаўнага музея гісторыі мастацтва па Вавелі ў Кракаве А. Кукліноўскі.

Па ўсёй паверхні раскопу зафіксаваны сьветла-шэры культурны слой таўшчынёю 0,3—0,5 м. Гэта слой прывазны. Яго завезьлі пасьля зьнішчэньня касьцёла і разраўнялі над руінамі. Гэта пацьвярджаюць сьведкі. Зямлю бралі, відавочна, недалёка ад замка — сярод знаходак ёсьць рэчы нават XII ст. Асноўная частка невялікай калекцыі археалагічных знаходак паходзіць менавіта з гэтага прывазнога слою. Акрамя рэчаў XX ст. знойдзены фрагменты паліванага, непаліванага, задымленага посуду XVII—XIX стст., фрагменты кафлі — пераважна XVII ст. Найбольш старажытныя знаходкі датуюцца XII ст. Гэта — фрагменты сьценкі і вечка гаршка і зусім незвычайная тут рэч — палова круглай (дыяметрам 6,5 см) маёлікавай пліткі зялёнага колеру з падлогі царквы XII ст.

Ніжэй прывазнога слою ў межах будынка касьцёла ідзе суцэльны будаўнічы друз — бітая і цэлая цэгла, кавалкі позьняй бетоннай падлогі. Знаходак тут амаль няма.

Ад касьцёла зьбераглісе толькі падмуркі, месцамі таксама — невялікія фрагменты мураваных сьценаў. Найбольшая глыбіня падмуркаў — да 3,5 м ад сучаснай дзённай паверхні. Муроўка падмуркаў мяшаная — з забутоўкі (вялікія камяні з бітай цэглай на вапнавай рошчыне). Асноўны аб'ём храма быў складзены з цэглы-пальчаткі. Вапнавая рошчына даволі тлустая. У вапну акрамя пяску дададзены жвір з дробнай галькай і патоўчанай цэглай (цамянкай). Варта адзначыць, што цамянка ўласьцівая мурам замка ў Любчы, а таксама — падмуркам палаца на Старым замку ў Гродне, які быў перабудаваны ў канцы XVI ст. Стэфанам Баторыем.

Перакрыцьці сутарэньняў касьцёла былі прабітыя пасьля выбуху, каб не пакідаць пустотаў пад зямлёю. Сутарэньні запоўнены будаўнічым друзам.

У межах апсіды расчышчана некалькі падвальных памяшканьняў, створаных перагародкамі XVII—XVIII стст. Яны выкарыстоўваліся ў якасьці крыптаў. Асноўная сьцяна апсіды вылучаецца памерамі: шырыня падмурка — 3,6 м; складзены ён у тэхніцы бутавай муроўкі з камянёў і цэглы-пальчаткі на вапнавай рошчыне. Апсіда дадаткова ўмацавана контрфорсам. Да таго ж для большай трываласьці пад яе ўсходнюю частку падведзена падмуркавая платформа з камянёў на вапне (першым заўважыў А. Кукліноўскі). Для пабудовы апсіды ўжывалася чырвоная цэгла, на адным з бакоў якой меласе 5—6 прамых барознаў. Сярэднія памеры цэглы: 26—28x13—14x6—7 см.

Першапачаткова касьцёл быў накрыты чырвонай плякатай дахоўкай, якая мае назву «бабровы хвост», бо яе канец нагадвае формаю хвост гэтай жывёліны. Такая дахоўка была пашырана на Беларусі ў XV—XVI стст. і знойдзена падчас раскопак Вільні і Старога замка ў Гродне. Таўшчыня плякатай дахоўкі, знойдзенай намі ў раскопе і шурфах вакол касьцёла, дасягае 1,7—2 см. Яна мае высокі (да 5 см) мацавальны шып трохкутнай формы.

Хвалістая дахоўка таўшчынёю 1 см датуецца XVIII ст. Даволі шмат сабрана кавалкаў складанапрофільнай польскай рэстаўрацыйнай дахоўкі 20-ых—30-ых гг. XX ст. Знойдзены таксама фрагменты шкляной дахоўкі гэтага ж часу.

Пры раскопках была цалкам ускрыта прыбудова да касьцёла XIX ст. з жоўтай цэглы на цэментавай рошчыне. Ад яе засталіся рэшткі сутарэньня з бетоннай падлогай і атынкаванымі сьценамі — вышынёю да 1,15 м. Уваход у сутарэньне быў з захаду. Гэта лесьвіца з цаглянымі приступкамі. З паўднёвага боку ў прастору сутарэньня выступае падмурак контрфорса апсіды.



План Фарнага касьцёла.

У шурфах вакол касьцёла было шмат знаходак XVII—XX стст. Гэта — паліваны, расьпісаны, мораны і непаліваны посуд, паліваная (і зрэдку паліхромная) кафля, цэгла, дахоўка, пліткі падлогі XIX ст., кавалкі сталовага і аптэкарскага шкляпога посуду, фрагменты «рэйнскай» керамікі, каваныя цьвікі і рэшткі кованай металічнай агароджы канца XIX—XX стст., якая некалі была каля касьцёла.

Найбольшая колькасьць знаходак была ў шурфах з боку вуліцы Замкавай. Відаць, тут некалі стаялі цагляныя крамы (бо трапілася шмат бітай цэглы і хвалістай дахоўкі), якія былі разбураны паводле загаду гродзенскага губернатара ў 1870 г.

У шурфе (з боку вуліцы Кастрычніцкай) прасочаны культурны слой з рэшткамі згарэлай драўлянай забудовы і знаходкамі XVI ст. (напрыклад, гаршковая кафля).

Такім чынам, на першым этапе дасьледаваньняў ускрыта частка апсіды касьцёла і прыбудовы да яе з паўночнага боку. З заходняга боку раскопак мы дайшлі да сьцяны, якая злучана з апсідай. У выніку шурфоўкі акрэсьлены і агульны план касьцёла.

Дасьледаваньні 1992 года паказалі перспектыўнасьць далейшай працы на помніку. Рэшткі яго велічных муроў выклікаюць значны эмацыянальны эфект і цалкам прыгодныя для музеефікацыі. На 1993 год плануецца працяг дасьледаваньняў.

[1] Мілінкевіч А., кс. Пашэнда Е. Фара Вітаўта ў Гродне // Наш радавод. Гродна. 1990. С. 182.
[2] Там сама.
[3] Кс. Пашэнда Е. Фара ў Гродне / рукапіс рэферата з канферэнцыі «Мастацкая культура эпохі барока ў Вялікім княстве Літоўскім». Варшава. 1989. (З прыватнага архіва І. Трусава).
[4] Там сама. С. 3.
[5] Кс. Пашэнда. Фара ў Гродне... С. 3.
[6] Там сама.
[7] Ядкоўскі Ю. Фара Вітаўта ў Гродне / рукапіс з прыватнай калекцыі Р. Бараноўскага з Гродна. С. 2.
[8] Там сама.
[9] Фотакопія з прыватнага архіва І. Трусава; арыгінал — у г. Дрэздэне.
[10] Акты Виленской Археографической Комиссии. Т. 7. С. 244.
[11] Сьведчаньні кс. Е. Пашэнды, які бачыў пацьверджаньне ў «дрэздэнскіх» паперах.
[12] Ядкоўскі Ю. Фара Вітаўта ў Гродне... С. 4.
[13] Рукапісны аддзел Бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы ў Вільні. А-2620, Г-273-2031.
[14] Там сама.
[15] Ядкоўскі Ю. Фара Вітаўта ў Гродне... С. 4.
[16] Там сама. С. 6.
[17] Орловский Е. Очерк истории города Гродно // Памятная книжка Гродненской Губернии за 1890 год. Гродно, 1890. С. 57.
[18] Цэнтральны Дзяржаўны гістарычны Архіў Рэспублікі Беларусь у Гродне (далей ЦДГА Гродна), ф. 14, воп. 2, спр. 47, к. 3 адв.
[19] Там сама, к. 5.
[20] Там сама, к. 7 адв.
[21] Орловский Е. Судьбы православия в связи с историей латинства и унии в Гродненской губернии в XIX столетии (1794—1900). Гродно, 1903. С. 193.
[22] Там сама. С. 195, 212.
[23] ЦДГА ў Гродне, ф. 14, воп. 2, спр. 47, кк. 7, 8.
[24] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласьці, ф. 484, воп. 1 спр. 297, к. 200.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ